— Дарэмна вы так думаеце. Несумненна, роля беспілотных лятальных апаратаў на перадавой высокая. Але тэхніка выходзіць са строю, у некаторых падраздзяленнях яе проста няма. Сабака — незаменны індыкатар прысутнасці або наблізення ворага. Магчымасці органаў пачуцця чатырохлапых у некалькі разоў лепш развіты, чым у чалавека. Мы не можам пачуць, што адбываецца за 300—400 метраў ад нас, а сабака гэта адчувае. Больш таго, сабакі, падрыхтаваныя па пэўных кірунках, шмат умеюць. Напрыклад, выяўляць разведгрупы праціўніка, вяртацца і папярэджваць аб гэтым свайго важатага. Пры гэтым сабака не будзе брахаць, а проста сваімі дзеяннямі, якія разумее толькі кінолаг, данясе патрэбную інфармацыю. Узяць іншы прыклад. Сучасны мінашукальнік — гэта добра, але, як паказвае СВА, пры размініраванні населеных пунктаў сабаку яшчэ ніхто не замяніў. Таму, як бы ні развівалася тэхніка, недаацэньваць магчымасці чатырохлапых байцоў не варта.

***— Узаемадзейнічаючы з іншымі сілавымі структурамі, якія задачы вырашаеце?***

— У кожнага сілавога ведамства — свае задачы, але кірункі дзейнасці, па якіх рыхтуюць службовых сабак, падобныя. Мы складаем планы, дамаўляемся аб выкарыстанні вучэбнай базы. Калегі прыязджаюць да нас, мы — да іх. Рыхтаваць сабаку ў адных умовах нельга: ён прызвычаіцца выконваць задачы толькі ў канкрэтным месцы. А трэба, каб жывёла праяўляла свае здольнасці ў любой абстаноўцы. Напрыклад, летась у нас па пошуку выбуховых рэчываў навучаліся пагранічнікі. Мы, у сваю чаргу, каб у боегатоўным стане ўтрымліваць сваіх сабак, якія спецыялізуюцца па пошуку наркатычных сродкаў, звяртаемся ў Міністэрства ўнутраных спраў. Або супрацоўнікі Нацыянальнага аэрапорта Мінск удасканальваюць свае веды на нашай базе, нам таксама ёсць чаму павучыцца ў іх. Пры гэтым узаемадзеянне паміж рознымі ведамствамі не абмяжоўваецца выкарыстаннем вучэбна-матэрыяльнай базы адзін аднаго. Мы ўдзельнічаем у сумесных семінарах, спаборніцтвах паміж сілавымі структурамі. Акрамя таго, рыхтуем кінолагаў і службовых сабак для іх. Наладжана ўзаемадзеянне і на міжнароднай арэне. Напрыклад, нашы сабакі выконваюць задачы ў Катары або Аб'яднаных Арабскіх Эміратах.

***— У кіналагічным цэнтры Узброеных Сіл ёсць свой гадавальнік. Вырошчваеце шчанят толькі для сябе або ёсць попыт на пародзістых чатырохлапых сярод цывільнага насельніцтва?***

— Асноўная наша задача — папаўненне пагалоўя службовых сабак ва Узброеных Сілах. Аднак нараджаецца шчанят больш, чым нам патрэбна. У нас ёсць ліцэнзія на іх продаж. Людзі з задавальненнем да нас звяртаюцца. Усе нашы сабакі сертыфікаваныя, маюць радаслоўную, адпаведнае ветэрынарнае суправаджэнне. Дарэчы, нашы спецыялісты аказваюць ветэрынарныя паслугі і гадаванцам цывільнага насельніцтва. Прапаноўваем увесь спектр паслуг: гэта і тэрапеўтычная, і хірургічная, і стаматалагічная дапамога. Попытам у мясцовага насельніцтва карыстаюцца і такія платныя паслугі, як дрэсіроўка і ўтрыманне сабак. Людзі з'язджаюць у адпачынак за мяжу, і сабаку няма з кім пакінуць, мы, у сваю чаргу, гатовы аказаць ім садзейнічанне: даглядаем, кормім, арганізоўваем адпаведнае ветэрынарнае суправаджэнне.

***— Андрэй Юр'евіч, кажуць, што практычна ўсіх сабак цэнтра вы ведаеце паіменна. А ці ёсць сярод іх любімчыкі?***

— Кожны мой працоўны дзень пачынаецца з таго, што я абыходжу тэрыторыю кіналагічнага цэнтра, у тым ліку вальеры, дзе сабакі праводзяць большасць свайго часу. Мой любімчык, бельгійская аўчарка па мянушцы Бард, з нядаўняга часу нясе службу ў войсках. Ёсць яшчэ любіміца — Урсула. Таксама бельгійская аўчарка. Чаму менавіта гэтыя сабакі? Напэўна таму, што я назіраў за імі з моманту нараджэння. Яны выраслі на маіх вачах.

***— А ці ёсць у начальніка кіналагічнага цэнтра хатні гадаванец?***

— Вядома. Гэта ёркшырскі тэр'ер па мянушцы Піт. Калі сын сыходзіў вучыцца ў Акадэмію МУС, мы заставаліся з жонкай удваіх. Каб не сумаваць, вырашылі завесці чатырохлапага сябра, аб чым ніколі не пашкадавалі.

***— Аб чым думаецца на пачатку новага дзесяцігоддзя цэнтра?***

— У першую чаргу, аб людзях, з якімі пашчасціла праходзіць службу. У нас створаны калектыў аднадумцаў. Прычым гэта датычыцца і ваеннаслужачых, і цывільнага персаналу. Выконваем пастаўленыя задачы, ставім перад сабой мэты, якіх заўсёды дасягаем. Хацелі стварыць добрую канкурэнтназдольную спартыўную каманду — мы яе стварылі. Вырашылі перайсці ад драўляных вальераў, якія ва ўмовах нашага надвор'я доўга не стаяць, да зборна-разборных — перайшлі. Зрабілі рамонт у тых памяшканнях, дзе ўтрымліваем службовых сабак. Пабудаваны вальеры для знаходжання шчанят і сабак у зімовых умовах. На дадзены момант ажыццяўляецца рамонт у штабе, казармах, сталовай. Многае зроблена сваімі рукамі, у тым ліку па ўдасканаленні вучэбна-матэрыяльнай базы. Сем-восем гадоў таму ў нас было ўсяго два вучэбныя класы. Цяпер у кожным вучэбным падраздзяленні — свой вучэбны клас. Больш таго, яны абсталяваныя па апошнім слове тэхнікі. Створаны летнія вучэбна-палявыя класы. Гэта ўсё дзякуючы людзям, якія тут працуюць і служаць. Ад душы жадаю ўсім ваеннаслужачым і цывільнаму персаналу моцнага здароўя, мірнага неба, поспехаў у службе і працоўнай дзейнасці. Упэўнены, што сумесна мы дасягнём вышынь. Самае галоўнае, у нас ёсць мэта — удасканальваць дзейнасць цэнтра па падрыхтоўцы службовых сабак для Узброеных Сіл, нашай краіны і з гонарам прадстаўляць сваіх сабак і ваеннаслужачых на міжнароднай арэне, даказваючы, што Беларусь займае годнае месца ў гэтай сістэме.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва кіналагічнага цэнтра Узброеных Сіл.**

Выхаванне патрыёта

# АРМЕЙСКАЯ ПРАФЕСІЯ ДЛЯ ШКОЛЬНІКА

## У Магілёве старшакласнікам прадэманстравалі магчымасці ДТСААФ і запрасілі на выставу пошукавага клуба «Віккру»

**Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту вельмі цесна супрацоўнічае са школамі. Штотыдзень на базе магілёўскага аб'яднання ДТСААФ ладзяцца экскурсіі для школьнікаў і навучэнцаў устаноў адукацыі. Аналагічную работу праводзіць і Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру». На гэты раз арганізацыі аб'ядналі свае намаганні.**



Старшыня Магілёўскага аб'яднання ДТСААФ Аляксандр КОНЬШЫН павіншаваў новых членаў ДТСААФ.

### Дадатковая спецыяльнасць і заняткі ў секцыях

Для вучняў 9—10 класаў армія — пакуль тэма абстрактная. Яны, вядома, тэарэтычна ведаюць, што значыць Айчыну абараняць, але яшчэ не вельмі атаясамліваюць сябе з гэтым. І ДТСААФ — менавіта тое месца, дзе па армейскай тэме добра падкоўваюць.

— Існуе дарожная карта, якая падпісана на ўзроўні Цэнтральнага савета ДТСААФ і Міністэрства адукацыі, — расказвае **старшыня Магілёўскага аб'яднання ДТСААФ Аляксандр КОНЬШЫН**. — Таварыства садзейнічае патрыятычнаму выхаванню моладзі і падрыхтоўцы да службы ў арміі, а таксама дае магчымасць атрымаць спецыяльнасці і навыкі, якія там спатрэбяцца.

Знаёмства дапрызыўнай моладзі з арганізацыяй пачынаецца з яе гісторыі і цяперашнімі магчымасцямі. Школьнікам расказваюць, што для будучых абаронцаў ёсць вельмі прыемныя бонусы. Напрыклад, яны могуць атрымаць вадзіцельскае пасведчанне бясплатна. Для гэтага трэба звярнуцца ў ваенкамат і прайсці медкамісію. Калі супрацьпаказанняў па здароўі няма,



Эдуард КАРПЮК і Дзмітрый ПАКЛОНСКІ глыбока ведаюць і армейскую, і ваенную тэмы.

выдаецца дазвол на атрыманне прафесіі вадзіцеля катэгорыі «С» або электрыка-асвятляльніка сілавых электрычных станцый. Пасля заканчэння ўручаецца адпаведны дакумент. Акрамя гэтага, ДТСААФ прапануе шмат іншых цікавых заняткаў, якія таксама вельмі карысныя для будучых абаронцаў.

— У нас ёсць спартыўныя секцыі, авіямадэльны гурток, матацыклетны спорт, фігурнае кіраванне матацыклам, джып-трыял, картынг, стралковая секцыя, страйкбол, пінтбол, хуткасная тэлеграфія і іншыя, — уводзіць моладзь у курс справы старшыня аб'яднання. — У кожнай секцыі займаецца прыкладна па 15—20 чалавек. Кіраўнікі ўсе высокакласныя. Азы хуткаснай тэлеграфіі выкладае вельмі дасведчаны спецыяліст Вольга Бегунова. Пад яе кіраўніцтвам падлеткі выязджаюць на абласныя і рэспубліканскія спаборніцтвы. У нас вельмі моцная школа. Вялікай папулярнасцю карыстаецца стралковая секцыя, там створаны ўсе ўмовы для заняткаў. Шмат хто цікавіцца фігурным кіраваннем матацыклам. Дзеці вывучаюць устройства транспартнага сродку, Правілы дарожнага руху, удзельнічаюць у спаборніцтвах на мотадроме.

Арганізацыя мае вялікі досвед у плане падрыхтоўкі моладзі да арміі. Вопыт работы паказаў, што, калі моладзь прыходзіць у армію падрыхтаванай, гэта вялікі плюс.

— Два разы ў год мы праводзім падрыхтоўку і перападрыхтоўку прызыўной моладзі, якая збіраецца ў армію па накіраванні ад ваенкаматаў, — адзначае суразмоўца. — Юнакі абучаюцца за кошт сродкаў Мінабароны і праз паўгода ідуць служыць, маючы на руках вадзіцельскае пасведчанне або пасведчанне электрыка.



Выстава ад «Віккру» зацікавіла і хлопцаў, і дзяўчат.

Атрымаць іх можа малады чалавек ва ўзросце ад 18 гадоў. А ў студзені да нас прыйдуць на перападрыхтоўку ваеннаслужачыя з Узброеных Сіл. Яны ўжо атрымалі катэгорыю «С», а для арміі патрэбны яшчэ катэгорыі «Е», што дазваляе працаваць з прычэпамі, і «D», каб можна было кіраваць аўтобусамі. Сярод гэтых людзей — і нашы папярэднія выпускнікі. Мы толькі здзіўляемся, наколькі хлопцы памужнелі за зусім кароткі час службы ў арміі.

### Цікавасць да вайсковай службы

Далучыць моладзь да тэмы абароны Айчыны дапамагаюць і **прадстаўнікі Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру» Эдуард КАРПЮК і Дзмітрый ПАКЛОНСКІ**. Яны наведваюць школы і грамадскія аб'яднанні, дзе займаюцца дзеці, расказваюць пра сваю дзейнасць і знаёмяць з узорамі зброі. Абодва цалкам пагліблены ў ваенную тэматыку. А дзеючы ваеннаслужачы танкавай вайсковай часці 63615 старшы прапаршчык Эдуард Карпюк — яшчэ і ў адзенні чырвонаармейца.

— Мы з Дзмітрыем не толькі пошукавікі, але яшчэ і рэканструктары, — удакладняе ён. — Удзельнічаем у пастановачных баях, здымаемся ў дакументальных рэпартажах, расказваем пра нашу дзейнасць.

Для школьнікаў яны арганізавалі цікавую выставу ваеннай амуніцыі. Дарэчы, частка яе — з асабістай калекцыі Эдуарда Карпюка. «Усё гэта калісьці было баявым, але дэактывавана і не з'яўляецца небяспечным, — расказвае ўладальнік прыватнай калекцыі. — Жонка і дочкі, якіх у мяне чатыры, маё хобі падтрымліваюць».

У калекцыі легендарны ПКШ — пісталет-кулямёт Шпагіна, «лімонкі», аўтаматы, карабіны, каскі, форма ваеннаслужачых... На асобным століку — тое, што было паднята падчас раскопак. Дзмітрый паказвае прабітую нямецкую каску, іржавую, знойдзеную на полі былых баёў, а Эдуард дэманструе яе «чыставы» варыянт.

Урачыстым момантам стала прыняцце трынаццаці навучэнцаў СШ № 42 у пярвічку ДТСААФ. Юнакі і дзяўчаты атрымалі членскія білеты і сталі паўнавартаснымі членамі арганізацыі.

— Гэта дзеці з паралеляў дзявятых і дзясятых класаў, яны захапіліся аповедамі прадстаўнікоў ДТСААФ, якія да нас прыходзілі, і выказалі жаданне далучыцца да арганізацыі, — удакладніў **кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні СШ № 42 Дзмітрый ДАВЫДАЎ**. — Школьнікі жадаюць атрымаць ваенную спецыяльнасць, хочуць быць стралкамі, вадзіцелямі. У школе мы вучымся страляць, ДТСААФ прадставіла нам зброю. У студзені будзе адкрыты гурток па навучанні кіраванню матацыклам. У нас пабудаваны аўтагарадок, адзіны ў Магілёве, з усімі неабходнымі знакамі, разметкай, святлафорамі. Школьнікі, якія сталі членамі ДТСААФ, змогуць там займацца. Будзе закуплена два матацыклы.

Хлопцам і дзяўчатам паказалі фільм пра дзейнасць ДТСААФ, арганізавалі экскурсію па кабінетах і ў лабараторыю. Яны ўбачылі, якая тэхніка знаходзіцца на ўзбраенні арганізацыі. Было заўважна, што ім гэта цікава.

Вучань 10 класа Павел Байдакоў хоча звязаць сваё жыццё з ваеннай прафесіяй і паступіць у Ваенную акадэмію. «У бацькі дзядзька быў ваенным, і мне захацелася, — усміхаецца хлопец. — Бацькі мне не расказвалі пра ДТСААФ, для мяне тут усё ў навінку, цікава і карысна. Хачу навучыцца ездзіць і атрымаць правы».

Мірон Чайкоўскі вучыцца ў 9-м класе. Яго асабліва зацікавіла інфармацыя пра пілотаў, якія займаюцца пры ДТСААФ. «Пра тое, што тут існуе аэраклуб, даведаўся, калі ў школу прыходзілі прадстаўнікі ДТСААФ, — кажа Мірон. — Захацелася паспрабаваць».

Дзесяцікласнік Ягор Шагойка запісаўся ў ДТСААФ, каб атрымаць вадзіцельскае пасведчанне. У арміі юнак хоча быць вадзіцелем. Па яго словах, гэта спецыяльнасць ніколі не нашкодзіць. Хлопцы прызнаюцца, што ім вельмі не хапае канкрэтных ведаў пра армію. Кажуць, што нават пра такую традыцыю, як дэмбельскі альбом (быў такі своеасаблівы рытуал у савецкі час), чуюць упершыню. Але цяпер яны таксама частка ДТСААФ, і тыя магчымасці, якія перад імі адкрываюцца, выклікаюць непадробленую цікавасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**